# Аб суправаджэнні праектнай дзейнасці вучняў

Навучанне ў мінулым было прадметным, у будучыні яно будзе праектным.

*А. Шляйхер*

**Мікалай Іванавіч ЗАПРУДСКІ,**
прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі
ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»



Многія вядомыя і паспяховыя людзі падкрэслілі важнасць выкарыстання ў адукацыйным працэсе метаду праектаў (праектнага навучання). Сапраўды, пашырэнне выкарыстання настаўнікамі гэтага метаду з'яўляецца адной з адукацыйных тэндэнцый. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць шэраг фактаў. Па-першае, праектная дзейнасць вучняў знаходзіцца ў рэчышчы падыходаў, вызначаных стандартамі пачатковай, базавай і сярэдняй адукацыі: сістэмна-дзейнаснага, асобасна арыентаванага, кампетэнтнаснага і культуралагічнага. Па-другое, згадаем агульнапрызнаную мадэль кампетэнцый «4К». Пры выкананні праектных заданняў у вучняў развіваецца кожная з 4 кампетэнцый, вызначаных гэтай мадэллю: крытычнае мысленне, крэатыўнасць, камунікацыя і кааперацыя. Па-трэцяе, у падручніку па некаторых вучэбных прадметах ужо ўключана тэматыка магчымых вучнёўскіх праектаў, і ў нашай краіне праводзяцца конкурсы вучнёўскіх даследаванняў і праектаў.

Нагадаем, праект (ад лац. *projectus* «кінуты наперад») вобраз будучага выніку, прадстаўлены ў форме знакавай мадэлі або натуральнай копіі будучага аб'екта (збудавання, прылады). Пад праектам разумеюць не толькі вобраз меркаванага выніку, але і дзейнасць па яго атрыманні і ўсе стадыі яго вытворчасці — ад зараджэння ідэі да яе ўвасаблення.

Метад праектаў з пункту гледжання настаўніка — гэта дыдактычны сродак, які дазваляе навучаць праектаванню, падчас якога вучні авалодваюць актуальнымі ведамі і ўменнямі, сацыяльнымі і спазнавальнымі кампетэнцыямі. З пункту гледжання вучня гэта магчымасць рабіць нешта цікавае (самастойна / з аднакласнікамі), гэта дзейнасць, якая дазваляе праявіць сябе, паспрабаваць свае сілы, ужыць свае веды.

Вучнёўскія праекты могуць быць вельмі розныя. Іх можна класіфікаваць па прадметнай галіне, змесце дамінуючай дзейнасці, узроўню кантактаў, колькасці ўдзельнікаў, працягласці працы над ім, крыніцы праектнай ініцыятывы, па аўдыторыі, у якой ён будзе прэзентавацца, і інш. Заўважым, што

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»